**Д. Касценіч**

# СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ЛІЧЭБНІКАЎ *АДЗІН* І *ONE*

Даклад прысвечаны супастаўляльнаму аналізу словаўтваральных гнёздаў з вяршынямі-лічэбнікамі *адзін* і *one*.

Мэта даследавання – устанавіць рысы падабенства і адрознення ў саставе і структуры словаўтваральных гнёздаў з вяршынямі-лічэбнікамі *адзін* і *one* у беларускай і англійскай мовах.

Актуальнасць абумоўлена неабходнасцю даследавання асаблівасцей дэрывацыйных працэсаў у беларускай мове ў супастаўленні з англійскай – мовай міжнародных зносін; адсутнасцю спецыяльных работ, прысвечаных супастаўляльнаму аналізу словаўтваральных гнёздаў з вяршынямі-лічэбнікамі ў неблізкароднасных мовах. Актуальнасць працы вызначаецца таксама значнасцю даследавання заканамернасцей адлічэбнікавага словаўтварэння ў беларускай і англійскай мовах. Даследаванне словаўтваральнага гнязда як комплекснай адзінкі любой мовы адкрывае шмат магчымасцей для глыбокага разумення сутнасці дэрывацыйных працэсаў.

Фактычным матэрыялам паслужылі 90 вытворных, кампанентаў гнёздаў, выбраных з нарматыўных слоўнікаў беларускай і англійскай моў.

Выяўлена, што словаўтваральны патэнцыял лічэбніка *one* у англійскай мове значна меншы, чым у беларускай, паколькі ад яго ўтворана значна менш слоў: у англійскай мове – 25 дэрыватаў, у беларускай мове – 65 дэрыватаў. У англамоўным гняздзе дэрывацыя адбываецца на 2 ступенях, у беларускамоўным – на 3.

У словаўтваральных гнёздах з вяршынным лічэбнікам *адзін/one* у беларускай і англійскай мовах можна выявіць і агульныя заканамернасці.

Дэрывацыя адбываецца найбольш актыўна на I ступені, у межах якой утвараюцца пераважна складаныя назоўнікі і прыметнікі, як адносныя, так і якасныя. Больш за ўсё ўтвараецца адносных прыметнікаў. Словаўтваральная парадыгма II ступені складаецца з дэрыватаў, утвораных суфіксальным спосабам. Асноўныя спосабы ўтварэння дэрыватаў – афіксацыя і складанне. Але ў англамоўным гняздзе пераважае словаскладанне, а ў беларускамоўным – афіксацыя. Найбольш прадуктыўны словаўтваральны тып у бела-

рускамоўным гняздзе – складанасуфіксальныя адносныя прыметнікі з сінанімічнымі суфіксамі *-н-* і *-ов-*; у англамоўным прысутнічае эквівалентны словаўтваральны тып: складанасуфіксальныя адносныя прыметнікі з суфіксам *-ed-*.